УДК 902/904(476)(091)”18/19”

**В. У. Мядзведзева,** кандыдат гістарычных навук
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
вул. Акадэмічная, 1, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (33) 668 87 53, olgamedv@history.by

# НАВУКОВЫЯ НАПРАМКІ БЕЛАРУСКАЙ АРХЕАЛОГІІ (XIX — ПЕРШАЯ ТРЭЦЬ XX СТАГОДДЗЯ)

У артыкуле прадстаўлены і аналізуюцца навуковыя напрамкі ў беларускай археалагічнай навуцы перыяду XIX — першай трэці XX стагоддзя. Да іх ліку адносяцца: горадазнаўства, краніялогія, архітэктурна-археалагічны, палеалітазнаўства, археазаалогія і археабатаніка. Тэма з’яўляецца вельмі актуальнай на сучасным этапе развіцця беларускай археалагічнай навукі, таму што напрамкі, якія зарадзіліся яшчэ ў XIX стагоддзі, зараз працягваюць актыўна развівацца на высокім навуковым узроўні і з’яўляюцца аднымі з галоўных у беларускай археалогіі, а таксама садзейнічаюць яе далейшаму паспяховаму развіццю. У артыкуле прыведзена вызначэнне напрамкаў, асэнсаванне іх сутнасці, пададзена характарыстыка кожнага напрамку, а таксама прадстаўлена неабходнасць іх далейшай поўнай распрацоўкі, у чым і заключаецца актуальнасць, навуковая навізна і практычная значнасць дадзенай працы.

**Ключавыя словы:** напрамкі; горадазнаўства; краніялогія; архітэктурна-археалагічны; палеалітазнаўства; археазаалогія; археабатаніка.
Бібліягр.: 45 назваў.

**V. U. Medvedeva,** Ph. D. in History
State Scientific Institution “The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus”,
1 Academic Str., 220072 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (33) 668 87 53, olgamedv@history.by

# SCIENTIFIC DIRECTIONS OF BELARUSIAN ARCHAEOLOGY (XIX — FIRST QUARTER OF THE XX CENTURY)

The article presents and analyzes scientific trends in the Belarusian archaeological science of the period of the 19th — the first third of the 20th century. Among them are the following areas: urban history, craniology, architectural and archeology, paleolithic studies, archaeozoology and archaeobotany. The topic is very relevant at the current stage of the development of Belarusian archaeological science, because the directions, some of which originated as early as the 19th century, now continue to actively develop at a high scientific level and are among the main ones in Belarusian archeology, and also contribute its further successful development. In the article, the directions are defined, their essence is understood, and the characteristics of each direction are given, as well as the need for their further full development is presented, which is the relevance, scientific novelty, and practical significance of this work.

**Key words:** directions; urban studies; craniology; architectural and archaeological; paleolithic studies; archaeozoology; archaeobotany.
Ref.: 45 titles.

Рэпазіторый БарДУ

**Уводзіны.** У гісторыі развіцця беларускай археалагічнай навукі да гэтага часу былі разгледжаны і прааналізаваны многія пытанні. Аднак рознабаковыя навуковыя напрамкі толькі закраналіся асобнымі даследчыкамі, падрабязна і дасканала яны не вывучаліся. Таму мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца вылучэнне, апісанне і абагульненне кожнага з напрамкаў у беларускай археалогіі. Пачаткі навуковых напрамкаў у археалагічнай навуцы Беларусі вядомы з XIX стагоддзя (горадазнаўства і краніялогія). Асноўныя напрамкі пачалі зараджацца толькі ў 20—30-я гады XX стагоддзя (архітэктурна-археалагічны, палеалітазнаўства, археазаалогія, археабатаніка).

**Матэрыялы і метады даследавання.** Даследаванне грунтуецца на шматлікіх археалагічных, архітэктурна-археалагічных, гістарычных матэрыялах і працах беларускіх, рускіх

© Мядзведзева В. У., 2024

і польскіх даследчыкаў, праведзеных імі і ўведзеных у навуковы абарот на працягу XIX — першай трэці XX стагоддзя. У артыкуле выкарыстаны агульнанавуковыя і гістарычныя метады: сінтэз, апісанне, аналіз, а таксама тыпалагічны, параўнальны, сістэмны.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Адзін з першых навуковых напрамкаў беларускай археалагічнай навукі — горадазнаўства (гарадская археалогія) распрацоўваецца з 20-х гадоў XIX стагоддзя. Археолаг, этнограф З. Даленга-Хадакоўскі ўпершыню выявіў і абследаваў старажытныя гарадзішчы ў Віцебску, Полацку, Брэсце, Магілёве, Гомелі, Тураве, Ваўкавыску, зрабіў іх замалёўкі [1].

Пачынаючы з 80—90-х гадоў XIX стагоддзя, вывучэнне гарадоў звязана з імёнамі рускага гісторыка, археолага М. П. Авенарыуса і беларускага археолага, этнографа Е. Р. Раманава. М. П. Авенарыус у 1880-я гады ў Драгічыне на р. Буг адкрыў і абследаваў старажытнае гарадзішча, сабраў калекцыю свінцовых пломбаў, якія перадаў у Імператарскую археалагічную камісію [2, с. 3—42].

Е. Р. Раманаў першым пачаў праводзіць археалагічныя даследаванні гарадоў, у прыватнасці Лукомля і яго манастыра (1880-я гады). У 1886 годзе правёў невялікія раскопкі на гарадзішчы і Замкавай гары ў Магілёве. У 1894 годзе абследаваў дзядзінец Віцебска, дзе сабраў багаты археалагічны матэрыял, а ў 1895-м праводзіў раскопкі Замкавай гары [3, с. 6; 4].

Справу Е. Р. Раманава ў другой палове 1920-х — пачатку 1930-х гадоў працягвалі беларускія археолагі А. М. Ляўданскі, С. А. Дубінскі, А. Д. Каваленя і інш. Археалагічныя абследаванні, шурфоўкі, раскопкі праводзіліся ў Заслаўі, Оршы, Барысаве, Полацку, Віцебску (А. М. Ляўданскі), Чачэрску, Рагачове, Магілёве (А. М. Ляўданскі, С. А. Дубінскі, А. Д. Каваленя), Гарадку (А. М. Ляўданскі, А. Д. Каваленя), Слуцку, Лепелі (С. А. Дубінскі), Тураве, Лукомлі, Друцку (А. Д. Каваленя), Магілёве (В. Р. Тарасенка), Гомелі і Брагіне (І. Х. Юшчанка), Мсціслаўлі (Я. Г. Вяржбіцкі), Глуску (А. І. Рынейскі, М. М. Канвісараў).

У 1926 годзе даследаваліся Мінск, Заслаўе, Гомель. У Мінску археалагічны нагляд пры земляных працах на Ніжнім рынку і Нямізе рабіў Д. І. Даўгяла. У траншэях зафіксаваны насцілы драўляных маставых і сабраны археалагічныя артэфакты, па якіх выяўлены слой датаваўся XVI—XVIII стагоддзямі. А. М. Ляўданскі праводзіў раскопкі на гарадзішчы «Замэчак» і ўмацаванні «Вал» у Заслаўі, знайшоў шматлікія матэрыялы, характэрныя для сярэднявечнага горада. У Гомелі І. Х. Юшчанка правёў шурфоўкі на гарадзішчы, дзе выявіў культурны пласт з ляпной і ганчарнай керамікай [5, с. 3; 6, с. 1—92; 7, с. 513—515].

У 1927 годзе студэнты гістарычнага факультэта БДУ А. Д. Каваленя, С. С. Шутаў праводзілі археалагічныя працы на гарадзішчы Турава. Яны заклалі два шурфа і атрымалі матэрыялы, характэрныя для старажытнага горада [8, с. 373—374].

Асноўная большасць гарадоў абследавана ў 1928 годзе, у некаторых праведзены археалагічныя раскопкі. Экспедыцыя ў складзе А. М. Ляўданскага, С. А. Дубінскага, А. Д. Кавалені і І. І. Рытар праводзіла працы на гарадзішчах Оршы, Віцебска, Полацка, Барысава, Магілёва, Чачэрска. Акрамя гарадзішчаў у Віцебску даследаваны Верхні і Ніжні замкі, у Полацку — Верхні і Ніжні замкі, Запалоцце. Я. Г. Вяржбіцкі ў гэты год абследаваў гарадзішча ў Мсціслаўлі [9, с. 36—44; 10, с. 93—94; 11, с. 161—172].

У 1929 годзе А. М. Ляўданскі і С. А. Дубінскі ажыццявілі невялікія раскопкі на гарадзішчах у Слуцку і Тураве і выявілі розныя артэфакты, характэрныя для гарадской культуры [12, с. 511].

У 1930 годзе таксама былі праведзены археалагічныя даследаванні ў некаторых гарадах(Лукомль, Друцк, Магілёў, Рагачоў, Брагін). А. Д. Каваленя даследаваў гарадзішчы ў Лукомлі і Друцку, В. Р. Тарасенка ажыццявіў невялікія раскопкі ў Магілёве на Пелагееўскім гарадзішчы. А. М. Ляўданскі і С. А. Дубінскі правялі раскопкі на гарадзішчы «Замкавая гара» ў Рагачове, І. Х. Юшчанка абследаваў гарадзішча ў Брагіне [13, с. 188—195; 14, с. 232; 15, с. 238; 16, с. 241—242].

У 1931 годзе комплекснай экспедыцыяй БАН у складзе А. М. Ляўданскага, С. А. Дубінскага, А. Д. Кавалені, В. Д. Дружчыца і іншых даследчыкаў пры правядзенні археалагічных прац абследавана гарадзішча ў Лепелі [14, с. 233].

Рэпазіторый БарДУ

Горадазнаўства ў 1920—1930-я гады актыўна развівалася і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Польшчы. Польскія і беларускія навукоўцы, краязнаўцы (Я. Альхімовіч, В. В. Іадкоўскі, З. Дурчэўскі, Р. Якімовіч, Я. І. Пастэрнак і інш.) праводзілі археалагічныя працы ў Друі, Ваўкавыску, Гродне, Давыд-Гарадку, Брэсце.

У 1920-я гады краязнаўца Я. Альхімовіч праводзіў раскопкі ў Друі і выявіў сляды абарончага вала ад р. Друйкі да плошчы святых Пятра і Паўла, зрабіў яго прарэзку. У 1925 годзе дырэктар Гродзенскага музея, археолаг В. В. Іадкоўскі ажыццявіў раскопкі ў Ваўкавыску на замчышчы і Шведскай гары, выказаў меркаванне, што старажытны горад зарадзіўся ў гэтых месцах. У 1932—1935 гадах ён правёў археалагічныя працы ў Гродне: на Замкавай гары выявіў княжацкі церам і рэшткі дзвюх цэркваў, на Каложскім пасадзе даследаваў Барыса-Глебскую царкву [17; 18, с. 1—17; 19].

На працягу 1937—1939 гадоў раскопкамі на Замкавай гары Гродна і дзядзінцы на захад ад Ніжняй царквы кіраваў польскі археолаг З. Дурчэўскі. На дзядзінцы ўскрыта частка драўлянай забудовы XII—XV стагоддзяў, выяўлены розныя археалагічныя артэфакты [20].

У 1936 годзе у Давыд-Гарадку на Замкавай гары капалі катлаван для пабудовы царквы і выявілі драўляныя збудаванні, труны. Першым абследаваў на замчышчы выяўленыя пахаванні дырэктар Беларускага музея ў Вільні А. І. Луцкевіч. Інфармацыя аб працах была надрукавана ў прэсе, на яе звярнуў увагу дырэктар Варшаўскага археалагічнага музея Р. І. Якімовіч. У 1937—1938 гадах ён правёў у Давыд-Гарадку археалагічныя раскопкі. У выніку адкрыта 12 драўляных збудаванняў, вывучаны абарончы вал, замкавая капліца, 23 труны [21, с. 112—116; 22].

У канцы 1930-х гадоў інжынер Гучазмін кіраваў раскопкамі на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Нагляд за працамі праводзіў падпалкоўнік войска польскага Т.-М. Жук-Рыбіцкі. У 1938 годзе ён правёў раскопкі ў Брэсце, дзе выявіў кладку з валуноў і драўляныя канструкцыі [23, с. 171—177].

*Краніялогія.* «Краніялогія (ад грэч. kranion — чэрап + logos — навука) — раздзел анатоміі чалавека і жывёл, які вывучае індывідуальныя і групавыя варыяцыі памераў, формы чэрапа і асобных яго частак.» [24, с. 463].

У XIX стагоддзі зарадзіўся і краніялагічны напрамак. З'яўленне яго звязана з імёнамі рускіх навукоўцаў: заолага, палеантолага С. С. Куторгі і антраполага, этнографа У. М. Майнова. С. С. Куторга ў 1842 годзе на тэрыторыі Мінскай губерні выявіў два чалавечыя чарапы каменнага веку. Даследаваў іх і надрукаваў грунтоўныя артыкулы, адзін быў апублікаваны ў нямецкім часопісе. Гэта былі першыя працы краніялагічнага напрамку па беларускіх матэрыялах. У. М. Майноў вывучаў чарапы з археалагічных раскопак Е. Р. Раманава ў 1870-х гадах на тэрыторыі Віцебскай губерні [25, с. 466; 26, с. 35—39; 27, с. 118—119].

«Калекцыі краніялагічных матэрыялаў са старажытных пахаванняў на тэрыторыі Беларусі пачалі стварацца ў 2-й пал. XIX ст. Частка іх захавалася ў НДІ і Музеі антрапалогіі пры Маскоўскім ун-це (160 чарапоў), у Вільнюскім (67) і Кракаўскім Ягелонскім (81) ун-тах. У 1920-я гг. матэрыялы з раскопак А. М. Ляўданскага і І. А. Сербава ляглі ў аснову першай краніялагічнай калекцыі БелАН, якая налічвала звыш 100 чарапоў з курганных пахаванняў 10–13 стст. полацкіх крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў і ўпершыню даследавана ў 1932 г. Г. Ф. Дэбецам.» [24, с. 464].

Асновы краніялагічнага напрамку ў сучаснай археалагічнай навуцы Беларусі заклалі ў 1920—1930-я гады беларускі антраполаг А. А. Смірноў і рускі антраполаг, прафесар Г. Ф. Дэбец. А. А. Смірноў вывучаў чарапы з археалагічных раскопак курганных могільнікаў на Міншчыне і Магілёўшчыне А. М. Ляўданскага і І. А. Сербава. Г. Ф. Дэбец апрацоўваў краніялагічныя матэрыялы з даследаванняў А. М. Ляўданскага ў Заслаўі і Барысаве, С. А. Дубінскага (курганныя могільнікі каля Заслаўя), І. А. Сербава (курганы каля Мінска і на Магілёўшчыне). Навуковец збіраў і ў этнагенетычным плане даследаваў матэрыялы пра старажытнае насельніцтва Беларусі X—XIII стагоддзяў [28, с. 69—80; 29, с. 93—95].

Рэпазіторый БарДУ

У 1920—1930-я гады ў археалагічнай навуцы Беларусі ўпершыню пачалі распрацоўвацца новыя навуковыя напрамкі: архітэктурна-археалагічны, палеалітазнаўства, палеанталогія (археазаалогія і археабатаніка).

*Архітэктурна-археалагічны напрамак.* У 1920-я гады заснаваны новы навуковы напрамак — архітэктурна-археалагічны. Аднак помнікі архітэктуры вывучаліся археолагамі з 1910-х гадоў. На працягу 1913—1914 гадоў В. В. Іадкоўскі праводзіў даследаванні архітэктурных аб’ектаў у Гродне, Лідзе, Міры, Крэве, Сынкавічах [30, с. 59—72].

У 1920—1930-я гады помнікі старажытнай беларускай архітэктуры даследавалі ў Віцебску, Полацку (І. М. Хозераў, М. М. Шчакаціхін, А. М. Ляўданскі) і Навагрудку, Гродне, Крэве (Е. Рэмер, Р. Гюртлер, О. Сасноўскі, Я. Бароўскі, В. В. Іадкоўскі, З. Дурчэўскі, Я.-М. Вайцяхоўскі).

У Полацку ў 1926 годзе І. М. Хозераў і М. М. Шчакаціхін праводзілі даследаванні Сафійскага сабора і абследавалі верхнія часткі Спаскай царквы. У 1928 годзе І. М. Хозераў правёў раскопкі Барысаглебскай і Пятніцкай цэркваў, Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра, зрабіў абмеры ўцалелых рэштkaў храмаў, сфатаграфаваў і замаляваў фрэскавую размалёўку помнікаў [31, с. 277—292]. У тым годзе А. М. Ляўданскі з калегамі праводзіў абследаванні на тэрыторыях Спаса-Еўфрасіннеўскага і Барысаглебскага манастыроў [11, с. 170].

Вялікая ўвага архітэктурна-археалагічным працам надавалася і на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 1920-я гады варшаўскі архітэктар-кансерватар Е. Рэмер правёў даследаванні на Замкавай гары ў Навагрудку, дзе адкрыў падмуркі дзвюх вежаў і прасла сцяны паміж імі. Архітэктурна-археалагічныя працы ў горадзе аднаўлены ў 1930—1931 гадах пад кіраўніцтвам польскага інжынера і архітэктара Р. Гюртлера. У 1929—1933 гадах у Гродне польскі прафесар архітэктуры О. Сасноўскі праводзіў рэканструкцыю Фары Вітаўта, Стары замак у 1936 годзе даследаваў польскі рэстаўратар Я.-М. Вайцяхоўскі. У 1930—1931 гадах кансерватар помнікаў архітэктуры Я. Бароўскі кіраваў археалагічнымі працамі ў в. Крэва. Даследчык вывучаў старажытныя палацы ў Лявонпалі, Германавічах, Гняздзілаве Дзісненскага павету і інш. Ён таксама зрабіў кансервацыю замкаў на тэрыторыях Віленшчыны і Навагрудчыны [32, с. 520—531; 33, с. 163; 34, с. 181—190; 35, с. 119—142].

Пасля праведзеных даследаванняў у беларускіх гарадах былі падведзены першыя вынікі па вывучэнні такіх перспектыўных напрамкаў, як горадазнаўства і архітэктурна-археалагічны. А. М. Ляўданскім была пададзена першая і найбольш поўная гістарычная тапаграфія Полацка, выказаны правільныя меркаванні аб яго дзядзінцы і рамесным пасадзе, а таксама прыведзены невядомыя звесткі аб помніках архітэктуры — Сафійскім саборы і Бельчыцкіх храмах. Даследчык першым выказаў думку, што гарадзішча Віцебска пабудавана ў дафеадальны час. На тэрыторыях даследаваных гарадоў выяўлены старажытныя культурныя слаі, а таксама асветлены пытанні гістарычнай тапаграфіі і іншыя моманты.

*Палеалітазнаўства.* На тэрыторыі Беларусі ў XIX стагоддзі выяўлены археалагічныя помнікі каменнага веку: эпох мезаліту і неаліту. Аднак да 1920-х гадоў невядома ніводнай стаянкі эпохі палеаліту. У канцы XIX стагоддзя Е. Р. Раманаў выказаў меркаванне, што тэрыторыя Беларусі была заселена чалавекам з палеалітычнай эпохі [4].

У другой палове 1920-х гадоў беларускі археолаг К. М. Палікарповіч упершыню адкрыў помнікі эпохі палеаліта ў Гомельскай вобласці. У 1926 годзе даследчык знайшоў першую стаянку каля в. Бердыж Чачэрскага раёна, а ў 1928-м выявіў стаянку каля мястэчка Юравічы Калінкавіцкага раёна [36, с. 358—360; 37, с. 123—252]. З гэтага часу пачалася распрацоўка такога напрамку, як палеалітазнаўства.

У 1927 годзе Інбелкульт арганізаваў комплексную экспедыцыю па вывучэнні Бердыжскай стаянкі. Узначаліў яе расійскі археолаг з Дзяржаўнай акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры С. М. Замятнін. У склад экспедыцыі ўваходзілі беларускія і расійскія даследчыкі: К. М. Палікарповіч, С. А. Дубінскі, С. С. Шутаў, І. Х. Юшчанка, Г. Ф. Мірчынк. С. М. Замятнін упершыню датаваў стаянку верхнепалеалітычным часам, вызначыў яе роднасць да культур касцёнкаўска-вілендорфскага кола і зрабіў выснову аб заляганні стаянкі *in situ* [38, с. 479—490].

Рэпазіторый БарДУ

У 1928—1929, 1938—1939 гадах К. М. Палікарповіч кіраваў Бердыжскай палеалітычнай экспедыцыяй, у 1929 і 1931 гадах раскопваў Юравіцкую палеалітычную стаянку. Пры раскопках гэтых стаянак навуковец атрымаў багаты археалагічны матэрыял. Сабраныя дадзеныя далі падставу ўпершыню выказаць думку аб засяленні першабытным чалавекам тэрыторыі сучаснай Беларусі ў эпоху сярэдняга палеаліту [39, с. 227—230].

Зараджэнне палеанталагічнага (археазаалагічнага, археабатанічнага) напрамку ў беларускай археалогіі звязана з імёнамі В. І. Громава, К. А. Фляксбергера.

*Археазаалогія.* «Археазаалогія (ад грэч. archaios — старажытны + zōon — жывёла + logos — слова, вучэнне) — навуковая галіна, якая вывучае фаўністычныя рэшткі з археалагічных помнікаў. …Рэшткі млекакормячых з археалагічных помнікаў Беларусі ад палеаліту да сярэднявечча з 1930-х гг. вывучалі расійскія даследчыкі В. Я. Гарут, В. І. Громаў.» [40, с. 43].

Трэба адзначыць, што касцяныя рэшткі вымерлых жывёл на тэрыторыі Беларусі пачалі збіраць у XVIII стагоддзі. Актыўна гэты працэс працягваўся ў XIX стагоддзі і асабліва ў першай чвэрці XX стагоддзя. Да 1930-х гадоў выяўлена і нанесена на карту 101 месцазнаходжанне рэштак касцей чацвярцічных жывёл (40 месцаў абследаваны) [41, с. 167—185].

Рускі заолаг, палеантолаг В. І. Громаў у 1920-х гадах апрацоўваў фаўністычны матэрыял, здабыты пры даследаваннях стаянкі каля в. Бердыж. Даследчык таксама вывучаў астэалагічны матэрыял з іншых археалагічных помнікаў Беларусі [42, с. 7—30; 43, с. 213—217].

*Археабатаніка.* «Археабатаніка (ад грэч. archaios — старажытны + botanikē ад botanē — трава, расліна) — навука, якая вывучае рэшткі расліннага паходжання з раскопак помнікаў археалогіі: абпаленае збожжа, адбіткі раслін на кераміцы, матэрыялы, атрыманыя ў выніку флатацыі культурнага пласта.» [44, с. 43].

Асновы археабатанічнага напрамку беларускай археалагічнай навукі заклаў рускі батанік К. А. Фляксбергер. Ён вывучаў гісторыю культурных злакаў, займаўся навуковай класіфікацыяй і сістэматызацыяй сартоў пшаніцы, у тым ліку па беларускіх археалагічных матэрыялах. У 1920—1930-я гады даследчык першым пачаў апрацоўваць археабатанічныя даныя па земляробству з археалагічных раскопак на Беларусі. У прыватнасці, ён даследаваў зёрны (пшаніцу, авёс, жыта і інш.) з раскопак С. А. Дубінскага на Банцараўскім гарадзішчы каля Мінска ў 1926—1928 гадах [45, с. 163—166].

**Заключэнне.** Першыя навуковыя напрамкі ў археалагічнай навуцы Беларусі ўпершыню зарадзіліся яшчэ ў XIX стагоддзі, гэта былі горадазнаўства і краніялогія, якія атрымалі далейшае развіццё ў 1920—1930-я гады. Тады ж з’явіліся новыя навуковыя напрамкі: архітэктурна-археалагічны, палеалітазнаўства, археазаалогія, археабатаніка. Адным з першых і найбольш значных да цяперашняга часу навуковых напрамкаў у беларускай археалагічнай навуцы з’яўляецца горадазнаўства. Пачынаючы яшчэ з XIX стагоддзя, археолагамі праводзіліся абследаванні і невялікія раскопкі ў некаторых беларускіх гарадах: Віцебску, Полацку, Магілёве, Драгічыне і інш. У першай трэці XX стагоддзя рознабаковыя археалагічныя даследаванні былі выкананы ўжо ў многіх гарадах: Друі, Оршы, Віцебску, Полацку, Заслаўі, Ваўкавыску, Гродне, Давыд-Гарадку, Брэсце і г. д. Побач з горадазнаўствам стаіць і архітэктурна-археалагічны напрамак, які актыўна развіваўся ў XX стагоддзі (Полацк, Гродна, Ліда, Мір, Крэва, Навагрудак і інш.), паспяхова архітэктурныя помнікі даследуюцца археолагамі і ў XXI стагоддзі. Вельмі значнымі для беларускай археалогіі з’яўляюцца такія напрамкі, як палеалітазнаўства, археаазалогія, археабатаніка, краніялогія. Асабліва шырокае і ўсебаковае даследаванне ў гэтых накірунках пачалося ў 1970-я гады і актыўна працягвае развівацца на сучасным этапе археалагічных даследаванняў, што ў поўнай меры садзейнічае далейшаму паспяховаму развіццю беларускай археалагічнай навукі.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Донѣсеніе о первыхъ успѣхахъ путешествія въ Россіи Зоріяна Долуга-Ходаковскаго изъ Москвы 13-го Липца 1822-го // Русскій историческій сборникъ. — М., 1844. — Т. 7. — 378 с.
2. *Авенариус, Н. П.* Дрогичинъ Надбужскій и его древности / Н. П. Авенариус // Матеріалы по археологіи Россіи. — СПб., 1890. — Т. 1, вып. 1. № 4. — С. 3—42.
3. *Н. Б.* Раскопки Замковой горы / Н. Б. // Витебскія губернскія вѣдомости. — 1895. — № 62. — С. 6.
4. *Романовъ, Е. Р.* Къ археологіи Сѣверо-Западнаго края Россіи / Е. Р. Романовъ. — Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1911. — 18 с.
5. *Даўгяла, З.* Стары Менск / З. Даўгяла // Звязда. — 1926. — № 207. — С. 3.
6. *Ляўданскі, А. Н.* Архэолёгічныя раскопкі ў м. Заслаўі Менскай акругі / А. Н. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Ін-т беларус. культуры. — Менск, 1928. — Т. I, кн. 5 : Працы катэдры археолёгіі. — С. 1—92.
7. *Юшчанка, I. Х.* Археолёгічныя досьледы ў Гомельскай акрузе / I. Х. Юшчанка // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 513—515.
8. *Каваленя, А. Д.* Матар'ялы з дагісторыі Тураўшчыны / А. Д. Каваленя, С. С. Шутаў // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 339—378.
9. *Ляўданскі, А. Н.* Археолёгічныя досьледы ў Аршанскай акрузе / А. Н. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 31—45.
10. *Ляўданскі, А. Н.* Археолёгічныя досьледы ў Віцебскай акрузе / А. Н. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 93—104.
11. *Ляўданскі, А. Н.* Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе / А. Н. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 157—198.
12. *Дубінскі, С. А.* Досьледы культур жалезнага пэрыюду па БССР у 1929 г. / С. А. Дубінскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 510—513.
13. *Каваленя, А. Д.* Археолёгічныя росшукі ў вярхоўях рэк Друці, Усяж-Бук і Лукомкі / А. Д. Каваленя // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 187—196.
14. *Ляўданскі, А. Н.* Кароткае паведамленьне аб досьледах культур эпохі жалеза ў БССР ў 1930—1931 гг. / А. Н. Ляўданскі // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 230—235.
15. *Тарасенка, В. Р.* Археолёгічная праца на Магілёўшчыне ў 1930 г. / В. Р. Тарасенка // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 237—239.
16. *Юшчанка, I. Х.* Археолёгічнае абсьледаваньне р. Брагінкі (вадазбор ніжняй Прыпяці) / I. Х. Юшчанка // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 241—242.
17. *Jodkowski, J.* Grodzisko Wołkowyskie / J. Jodkowski. — Grodno : Muzeum w Grodnie, 1925. — 43 s. : 17 il.
18. *Jodkowski, J.* Grodno wczesnośredniowieczne w świetle prac wykopaliskowych dokonanych na Królewskim zamku Starym w Grodnie w latach 1932 i 1933 / J. Jodkowski // Przegląd historyczno-wojskowy. — 1934. — T. 7, z. 1. — S. 1—17.
19. *Jodkowski, J.* Świątynia warowna na Kołoży w Grodnie: w świetle badań archiwalnych i archeologicznych, dokonanych w 1935 r. / J. Jodkowski. — Grodno : Graf. L. Mejłachowicza, 1936. — 70 s. : il.
20. *Durczewski, Z.* Stary Zamek w Grodnie w świetle wykopalisk dokonanych w latach 1937—1938 / Z. Durczewski. — Grodno : Wojewódzki Komitet, 1939. — 16 s.
21. *Луцкевіч, А. І.* Княжыя магілы ў Давыд-Гарадку / А. І. Луцкевіч // Калоссе. — 1937. — № 2. — С. 112—116.
22. *Jakimowicz, R.* Dawidgródek / R. Jakimowicz. — Pińsk : Polskie Towarzystwa Krajoznawcze, 1939. — 45 s.
23. *Піваварчык, С. А.* Невядомыя раскопкі Брэста ў 1938 г. / С. А. Піваварчык // Гістарычна-археалагічны зборнік / Нац. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Мінск, 1999. — № 14. — С. 171—177.
24. *Кушнір, А. І.* Краніялогія / А. І. Кушнір // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2009. — Т. 1. — С. 463—464.
25. *Куторга, С. С.* Записка о двухъ плосколобыхъ черепахъ изъ древнихъ кургановъ Минской губерніи / С. С. Куторга // Ведомости. — 1843. — № 100. — С. 466.
26. *Kutorga, S.* Notiz über zwei Menschen — Schodel aus dem Gouvernement Minsk / S. Kutorga // Verhandlungen der Russisch kais erlichen Mineralogischen Gesellschaft zu St.-Petersburg. — 1842. — S. 35—39.
27. *Майновъ, В. Н.* Описаніе череповъ изъ кургановъ Витебской губ. / В. Н. Майновъ // Извѣстія Императорскаго общества любителей естествознанія, антропологіи и этнографіи. — М., 1879. — Т. II. — С. 118—119.

Рэпазіторый БарДУ

28. *Дэбец, Г.* Чарапы Люцынскага магільніку і старажытных славян Беларусі і месца апошніх у палеантраполёгіі Ўсходняй Эўропы / Г. Дэбец // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 69—80.

29. *Сьмірноў, А. А.* Асноўныя дыямэтры і тып сэрый чарапоў курганнага пэрыоду / А. А. Сьмірноў // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Ін-т беларус. культуры. — Менск, 1928. — Т. I, кн. 5 : Працы катэдры археолёгіі. — С. 93—95.

30. *Иодковскій, О. О.* Замокъ въ Мире / О. О. Иодковскій // Древности. — 1915. — Т. 6. — С. 59—72.

31. *Хозераў, І.* Да пытаньня аб Спасаўскай царкве ў Полацку / І. Хозераў // Гістарычна-архэолёгічны зборнік / Ін-т беларус- культуры. — Менск, 1927. — № 1. — С. 277—292.

32. Кансервацыйныя работы на Замкавай гары ў Навагрудку. Агульная справаздача // ARCHE. Пачатак. — 2014. — № 4. — С. 520—531.

33. *Lorentz, S.* Konserwacja ruin zamków w Wileńszczyźnie i Nowogródczyźnie / S. Lorentz // Ochrona zabytków sztuki. — 1931. — Z. 1-4. — S. 163.

34. Raboty konserwatorskie na górze Zamkowej w Nowogródku // Ochrona zabytków sztuki. — 1931. — Z. 1-4. — S. 181—190.

35. *Wojciechowski, J.* Stary zamek w Grodnie / J. Wojciechowski // Biuletyn historii sztuki i kultury. — 1938. — R. VI, № 2. — S. 119—142.

36. *Даўгяла, З.* Знаходка палеолітычнае стаянкі ў Беларусі / З. Даўгяла // Гістарычна- архэолёгічны зборнік / Ін-т беларус. культуры. — Менск, 1927. — № 1. — С. 358—360.

37. *Палікарповіч, К. М.* Дагістарычныя стаянкі сярэдняга і ніжняга Сажа (па досьледах 1926 г.) / К. М. Палікарповіч // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Ін-т беларус. культуры. — Менск, 1928. — Т. I, кн. 5 : Працы катэдры археолёгіі. — С. 123—252.

38. *Замятнін, С. М.* Раскопкі Бердыскай палеолітычнай стаянкі ў 1927 г. / С. М. Замятнін // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 479—490.

39. *Палікарповіч, К. М.* Досьледы культур каменнага і бронзавага пэрыодаў у БССР у 1930—1931 гг. / К. М. Палікарповіч // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 227—230.

40. *Разлуцкая, А. А.* Археазаалогія / А. А. Разлуцкая // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2009. — Т. 1. — С. 43—44.

41. *Палікарповіч, К. М.* Знахадкі рэштак чацьвярцёвай фаўны на тэрыторыі БССР / К. М. Палікарповіч // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 167—185.

42. *Громаў, В. І.* Фаўна Бердыскай палеолітычнай стаянкі (па раскопках 1926—1927 гг.) / В. І. Громаў // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 7—30.

43. *Громаў, В. І.* Аб фаўне гарадзішч БССР і Смаленскай губ. / В. І. Громаў // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / Беларус. акад. навук. — Менск, 1930. — Т. II, кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. — С. 213—217.

44. *Лашанкоў, М. І.* Археабатаніка / М. І. Лашанкоў // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2009. — Т. 1. — С. 43.

45. *Фляксбэргэр, К.* Зёрны з Банцараўскага гарадзішча пад Менскам / К. А. Фляксбэргэр // Працы сэкцыі археолёгіі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. — Менск, 1932. — Т. III. — С. 163—166.

Паступіў у рэдакцыю 23.09.2024.

Репозиторий БарГУ